**Праверачная работа**
**6 клас**

Тэма :**Тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне**

Прачытайце тэкст. У падкрэсленых словах устаўце прапушчаныя літары і растлумачце правільнае напісанне слоў.

Восень

Шуміць лес. Шамаціць пад нагамі лісце. Дзі..ным веерам насыпала на яшчэ з…ленаватую траву залатовак прыгажуня-б..роза. **Дубы насцілаюць пад сабой цёмна-карычневую мяккую пасцель.** Лісце іх не ляціць далёка, яно ця..кае і нават у вецер падае амаль вертыкальна. Зоркай іншага сусвету бліснуў кл..новы ліст, што раптам з’явіўся перад вачыма на дарозе. Адкуль ён зляцеў? Ах, вунь ён дзе, клянок! Невялічкі, зусім непрыкметны побач з волатамі-дубамі. Колькі красы ён ра…сыпаў навокал! Мноства яго лісця – найпрыгажэйшы дыван, вытканы рукой дз..воснага мастака. І я не мог прайсці па ім у запыленых ботах. Я асцярожна адступіў і абышоў бокам. Усю дарогу праз лес мяне суправаджала нябачная птушка тоненькім жалобным плачам. Што яна страціла? Па чым плакала?... У памяці ўсплывалі кар…іны далёкага маленства. (паводле І.Шамякіна.)

2.Вызначце тып тэксту.
3. Вызначце, якія сказы па мэце выказвання сустракаюцца. Прывядзіце прыклады.
4. Выпішыце з тэксту па два прыклады назоўнікавых і дзеяслоўных словазлучэнняў.
5.Выпішыце сказ са зваротка м.
6.Выпішыце адзін развіты і адзін неразвіты сказы.
7.Зрабіце поўны сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.
8. Выпішыце тры словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.